ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

'90

ЧАЦВЕР
22
САКАВІКА
№ 9(1638)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

Першая асоба... Хто Вы?

Міністр? Першы прарэктар? Загадчык кафедры? Прарэктар па навуковай рабоце? Ці па алфавіту: Дзямчук, Капуцкі, Малевіч, Шушкевіч?

Несумненна адно: сёння універсітэт, як і ўся наша краіна, не мае права на памылку. Асабліва, калі размова аб замяшчэнні вакантнай пасады рэктара.

Зверыўшыся са здымкам, не спяшайцеся абвінавачваць наша пытанне ў рытарычнасці. Аднадушны лес рук на пасяджэнні вучонага савета сведчыць пакуль толькі аб занясенні ў спіс для галасавання кандыдатуры Фёдара Мікалаевіча Капуцкага, якога рэкамендавала большасць падраздзяленняў універсітэта. А сапраўдныя выбары адбудуцца праз тыдзень на пашыраным пасяджэнні Савета. Так хочацца, каб і атрымалася ўсё па-сапраўднаму: з каверзнымі пытаннямі і бліскучымі адказамі прэтэндэнта на званне першай асобы універсітэта, з гарачымі спрэчкамі і пераканаўчымі довадамі асвечанага розуму.

З кім пойдзем далей? Няблага было б пазнаёміцца, каб выбіраць асэнсавана? Што ж, згодны — чытайце матэрыялы другой старонкі.

ДРОБЯЗІ ЖЫЦЦЯ

УРА!??

Ура! Філфак займеў свой новы дом. Пасля зацяглай вайны за новы будынак, пасля шматлікіх зваротаў у інстанцыі ў філфака з'явілася альма-матэр. Можна было б, здаецца, разгарнуць плечы і падняць галовы дзвюм тысячам двухстам студэнтаў, якія туліліся ў 28 аўдыторыях пры наяўнасці 120 акадэмічных груп.

Новы будынак на Захарава, 59, на жаль далёка не новы. Нягледзячы на багата абстаўленыя зелянінай калідоры, яны маюць патрэбу ў капітальным рамонце, як і ўвесь былы будынак Інстытута павышэння кваліфікацыі настаўнікаў. Як настаўнікаў, а студэнтаў чацвёртага і пятага курсаў філфака, якія займаюцца там, ён не ўразіў ні аўдыторыямі, якія прыходзілася ствараць з некалькіх пакояў, разбураючы сцены, ні свежым паветрам новага храма навукі. У аўдыторыі і раздзявальню патрэбна ісці праз... прыбіральню.

«Проза жыцця»,— як заўважыў сакратар камітэта камсамола філфака У. Куліковіч. Сам Валодзя яшчэ не адвучыўся ў новым будынку ніводнай пары. Тлумачэнне зразумелае: «Нельга ж разарвацца паміж камсамольскімі справамі ў старым і заняткамі ў новым карпусах. Тым больш, да апошняга з інтэрната № 7 трэба дабірацца мінімум паўгадзіны».

Выкладчыкам прыходзіцца яшчэ горш. У некаторых з іх частка заняткаў у адным будынку, частка — у другім. Прыходзіцца круціцца-выкручвацца...

Можа таму на раскладзе заняткаў з'явіўся надпіс: «Будзем займацца ў родным корпусе».

Дэкан філфака А. А. Воўк не можа раздзяліць такога патрыятызму студэнтаў. Столькі пакутвалі, цяпер толькі жыць ды вучыцца ў новых «палатах». Яго пазіцыя: трэба асвойваць. Асвойваць не лепшы аб'ект — але такі далі. Як кажуць, даюць — бяры...

А мы «ура» крычаць пачакаем да лепшых часоў.

ТЭРМІНОВА Ў НУМАР

РАСКЛАД НА ПАСЛЯЗАЎТРА

Арыенцір № 1 — давер маладых

Першая рэспубліканская канферэнцыя ЛКСМ Беларусі...

Дыяпазон выказваемых думак і поглядаў незвычайна шырокі: ад пераканана-марксісцкіх (ледзь не з шашкай у руках) да адлучэння беларускай камсамольскай арганізацыі ад агульнасаюзнай.

Пераходны перыяд — так ахарактарызавалі становішча камсамола дэлегаты гэтай канферэнцыі. 19 сакавіка планавалася падрыхтаваць шмат прапаноў да XXI з'езда ВЛКСМ: новы статут ВЛКСМ, новая мадэль камсамола, і разам з тым новае месца «баявога авангарда» моладзі ў палітычнай сістэме грамадства.

Усё гэта прыемна, але чаму, напрыклад, не заўважылі недарэчнага пункта ў праграме камсамола... аб правядзенні традыцыйнага конкурса дзіцячага малюнка?

Якім быць камсамолу? Гэта тэма размовы і дыскусійнага цэнтра з мудрагелістай назвай: «Ідэйныя і палітычныя арыенціры абноўленага камсамола».

«Справа не ў назве,— пярэчыць намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта А. Русаковіч, дэлегат канферэнцыі,— арыенцір № 1 — аднавіць давер моладзі».

ЯКРАЗ ДЛЯ ВАС

Раз, два, тысяча дзвесце...

Вы памятаеце хвалюючы вальс школьнага балю, тое свята, тое паветра, якім так лёгка дыхалася ў час развітання са школай?

Маладзёжны цэнтр аматарскіх аб'яднанняў пры камітэце камсамола універсітэта прапануе вам сустрэцца на балі-дыскатэцы, дзе забаў будзе процьма і на любы густ: пантаміма, тэатр танца, вядома, вальс і нават ламбада. І ўсё гэта пасля не менш захапляючага відовішча — конкурсу на лепшую студэнцкую сям'ю. Яго прызавы фонд — 1200 рублёў. Свае прэтэнзіі на галоўны прыз конкурсу — грашовую прэмію ў 500 рублёў — прад'явілі чатырнаццаць пар. Не застануцца ў накладзе другія і трэція... ім адпаведна — 300 і 200 рублёў. Астатнія? Разам з усімі жадаючымі прайсці на гэты конкурс-дыскатэку-шоу будуць праз віць баль. Субота ёсць субота.

А ў буднія дні асабліва добрасумленна працавала над падрыхтоўкай будучага свята мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба Маргарыта Тарасава.

Так што, рыхтуйце вашы рублікі — білеты ў факультэцкіх камітэтах камсамола.

24 сакавіка, 18.00 гадзін, актавая зала галоўнага корпуса.

ІНФАРМБЮРО

22 САКАВІКА, у чацвер, у 14.30 у актавай зале галоўнага корпуса універсітэта адбудзецца сустрэча з пісьменнікам Эдуардам СКОБЕЛЕВЫМ, аўтарам зборнікаў вершаў «Дарога», «Кроплі дажджу», «Вячэрнія цені», кніг «Крокі за тваёй сцяной», «Цуд кахання», «Катастрофа», «Бяглец» і іншых.

ЗАВОЧНЫ КУРС ДУХОЎНАЙ СЕМІНАРЫІ

З лекцыяй на тэму «Уніяты — хто яны?» 23 сакавіка (пятніца) у 14.00. у актавай зале галоўнага корпуса БДУ выступіць протаіерэй Кафедральнага Сабору г. Мінска айцец Яўген.

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.

А Ў НАС!

«ЗЛАЧЫНСТВА» і «ПАКАРАННЕ»

Гэта не Дастаеўскі. Гэта назва дзвюх частак фільма «Віцебская справа» вядомага беларускага рэжысёра, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР Віктара Дашука.

Нашумелая справа. Нашумелы фільм. Аб ім і ўвогуле аб творчасці рэжысёра-дакументаліста ішла гаворка на сустрэчы з ім 15 сакавіка ў актавай зале галоўнага корпуса універсітэта.

Неардынарная справа. Неадназначны фільм. Як і Дастаеўскі і яго творчасць.

— Дастаеўскі для мяне — гэта прыклад таго, як людзі мастацтва могуць падняцца вышэй палітыкаў, гісторыкаў, ваенных. У «Бесах» пісьменнік яшчэ напярэдадні мінулага стагоддзя, да Булгакава, да Платонава даў зразумець, што нясе нам «бесаўшчына». Жывое яшчэ цемрашальства, якое мы павінны ўбачыць, адчуць, жахнуцца,— сказаў сваёй карцінай рэжысёр.

С. ШЧЭННІКАВА, студэнтка журфака.

ДАЕШ АЛЬТЭРНАТЫВУ!

Камітэт камсамола БДУ імя У. І. Леніна, Студэнцкі цэнтр аматарскіх аб'яднанняў аб'яўляе конкурс на стварэнне лепшых праектаў Статута універсітэта і Правілаў пражывання ў інтэрнаце.

Удзельнікамі конкурсу могуць быць студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта.

Мы спадзяёмся, што распрацоўка альтэрнатыўных праектаў дапаможа стварэнню найбольш дэмакратычных, рацыянальных і дзейсных статута і правілаў.

Канчатковы тэрмін здачы праекта — 10 красавіка 1990 года.

За лепшыя праекты ўстанаўліваюцца прэміі:

За статут Белдзяржуніверсітэта:

I прэмія — 250 РУБЛЁЎ,
II прэмія — 100 РУБЛЁЎ.

ДОШКА АБ'ЯЎ

За правілы пражывання ў інтэрнаце:

I прэмія — 100 РУБЛЁЎ,
II прэмія — 50 РУБЛЁЎ.

За даведкамі звяртацца ў камітэт камсамола універсітэта.

Дзяжурная служба «Беларускага універсітэта»: Сяргей ГРЫЦ (фота), Аляксандр КОКТЫШ.

ПРЭС-АПЫТАННЕ

«Як ацэньваеце праект Платформы ЦК КПСС да XXVIII з'езда партыі?»

С. ПЕТРАШКЕВІЧ, сакратар партыйнай арганізацыі хімічнага факультэта і НДІ ФХП:

— Платформа напісана тым старым кабінетам, які выдаваў такія ж дакументы раней. Не бачна радыкальных змен, якія так неабходны сёння.

Чаму не гаворыцца ў Платформе аб прамых выбарах партыйнага кіраўніцтва, аб членскіх узносах, нарэшце? Што датычыць апошняга, то вельмі хацелася б, каб пэўная частка іх заставалася ў пярвічнай партыйнай арганізацыі. Напрыклад, НДІ ФХП і хімфак штогод здаюць членскіх узносаў больш за 12 тысяч рублёў, а заплаціць за афармленне звычайнага стэнда грошай не маем.

Недапрацаваны атрымаўся праект. Вядома, будзем яго абмяркоўваць, удакладняць, але аснова ёсць, як і падставы ў тых, хто адмоўна ставіцца да партыі, яшчэ раз пакрытыкаваць яе: маўляў, якія былі, такія і засталіся.

Ю. ПАЗНЯК, асістэнт кафедры лікавых метадаў і праграмірвання мехмата:

— Выхад гэтага дакумента спазніўся па меншай меры на год. Але з'явіся ён раней, наўрад ці што-небудзь змянілася б. Людзі страцілі ўсялякую веру ў перамены да лепшага.

Наогул лічу, што апублікаванне праекта Платформы — гэта адцягненне людзей ад палітычнага жыцця.

Калі гаварыць канкрэтна, то варта было б прадугледзець пытанне аб стварэнні партарганізацый на месцах. Тады можна абмяркоўваць праблемы больш канкрэтна і прынцыпова, калі начальнік і падначалены не сядзяць на партыйным сходзе побач.

А. КІЛБАС, дацэнт механіка-матэматычнага факультэта:

— Зусім нядаўна я вярнуўся з-за мяжы. Вядома, пра падзеі ў рэспубліцы ведаў мала — нашых газет і часопісаў там амаль не атрымліваў. Мяне непрыемна ўразіла тое, што мы вельмі ўжо заўзята крытыкуем партыю. Прычым робяць гэта самі камуністы. Некалі нам малявалі вобраз ворага, але ён быў дзесьці далёка, а зараз, атрымліваецца, наш вораг — гэта партыя.

Так, не спрачаюся, былі ў партыі памылкі і пралікі, якія трэба тэрмінова выпраўляць. І агульнай лаянкай тут не паможаш. Неабходна канкрэтная дапамога. А хто можа і абавязаны аказаць яе, як не самі камуністы?

ВІЗІТКА

Фёдар Мікалаевіч КАПУЦКІ нарадзіўся ў 1930 годзе ў в. Селівонаўка Маладзечынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Беларус. У 1954 годзе закончыў хімічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння аспірантуры ў 1957 годзе працаваў асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам універсітэта і адначасова з 1965 да 1973 года дэканам хімічнага факультэта. З 1973 да 1985 года — намеснікам міністра вышэйшай і сярэдняй адукацыі БССР. З 1985 года — загадчык лабараторыі НДІ фізіка-хімічных праблем, з 1989 — загадчык кафедры, прарэктар па вучэбнай рабоце Белдзяржуніверсітэта.

Член-карэспандэнт АН БССР, доктар хімічных навук, прафесар, член КПСС, Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР, узнагароджаны ордэнам Знак Пашаны і дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

ПРЭТЭНДЭНТ



ПАЧНЁМ З ПАДМУРКА

— Аддаўшы больш за трыццаць гадоў жыцця вышэйшай школе, з якім пачуццём пазіраеце цяпер Вы на выпешчанае дзіця?

— З горыччу, бо доўгі час недаацэньваючы магчымасцей і не абцяжарваючы сябе падлікамі, мы каціліся ўніз.

Узровень адукаванасці — паказчык узроўню жыцця. І калі грамадства дазваляе сабе эканоміць на адукацыі — гэта самая спусташальная эканомія. Бо краіна малаадукаваных, дзе прыярытэтная сфера фінансуецца па астаткаваму прынцыпу, не можа быць квітнеючай. Падрыхтоўка навуковых і іншых кадраў — пытанне складанае. Асабліва, калі ва універсітэце, скажам, на аднаго студэнта, які вучыцца на дзённай форме навучання, даводзіцца 104 рублі ў год на набыццё абсталявання. Такім чынам, на 500 чалавек мы ў стане купіць толькі адзін камп'ютэр (пры ўмове, што ўсім астатнім мы забяспечаны).

Відавочна, не хапае нам не толькі сродкаў на адукацыю, але і ўмення рацыянальна імі карыстацца. Вось мы, калі параўноўваць з Амерыкай, разы ў два-тры болей рыхтуем інжынерных кадраў. Затое юрыстаў і эканамістаў выпускаем у дваццаць-дваццаць пяць разоў менш.

— Як ацэньваеце Вы сітуацыю ў сённяшнім універсітэце?

— Кожная вышэйшая навучальная ўстанова трымаецца на трох кітах: якасным саставе студэнтаў, прафесіяналізме і кампетэнтнасці прафесарска-выкладчыцкага саставу і добрым узроўні матэрыяльнай базы.

Што датычыць першага — конкурс пры паступленні ва універсітэт практычна на ўсіх факультэтах забяспечвае прыём здольных маладых людзей.

Зразумела, тут не ўсё проста. Цікавасць да вучобы відавочна знікае. Для гэтага ёсць падставы: навучальныя ўстановы не ізаляваны ад негатыўных з'яў жыцця нашага грамадства. Прычым нават высокія паказчыкі паспяховасці не заўсёды гарантуюць імгненнае прызнанне ў маладым чалавеку спецыяліста.

Прафесарска-выкладчыцкі састаў у нас дастаткова кваліфікаваны: больш за 130 доктараў навук, прафесараў і 800 дацэнтаў. Штогод абараняецца 12—14 доктарскіх і 95—200 кандыдацкіх дысертацый. І ўсё ж кваліфікацыя нашых кадраў выкарыстоўваецца далёка не ў поўнай ступені. Часам у здольнага маладога кандыдата навук проста фізічна не хапае часу для работы над доктарскай дысертацыяй, і ніхто не здагадаецца хоць часткова вызваліць яго ад педагагічнай работы, пазбавіць ураўнавальнага размеркавання вучэбных даручэнняў.

А як быць з тымі, хто не ўяўляе свайго жыцця без работы са студэнтамі? Садзейнічаць напісанню імі падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, стымулюючы працу над імі прадстаўленнем выкладчыкаў да вучонага звання прафесара ці дацэнта.

Нарэшце, становішча матэрыяльнай базы. Буду шчырым, гэта наш самы слабы, самы запушчаны ўчастак работы. І калі ў бліжэйшыя 5—7 год не прарвемся, на поспех нам разлічваць нельга. Ні ў падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў, ні ў развіцці навуковых даследаванняў. Будзе беззваротна страчаны час, і база стане тым тормазам, які не дазволіць нам рухацца наперад.

— А што наконт новага універсітэцкага гарадка, які ўжо прыдбаў сабе славу доўгабуда?

— Гэта менавіта тая праблема, якую рэктарату вырашаць у першую чаргу.

Мне даводзілася, працуючы ў Міністэрстве вышэйшай адукацыі, быць куратарам будаўніцтва. Ёсць там і галіна «Асвета». Але калі мы заяўлялі які-небудзь аб'ект, нам адмаўлялі: «Вы — не асвета». Так і жылі без свайго радка ў дзяржаўных планах.

А новы універсітэцкі гарадок пачаў расці яшчэ ў мінулым годзе. Праўда, з двухсот тысяч рублёў на будаўніцтва інтэрната на тысячу месцаў асвоілі толькі трыццаць. У гэтым годзе нам вылучылі мільён сто пяцьдзесят тысяч: пачалі будаўніцтва біялагічнага корпуса, сталовай, галоўнага корпуса. Адначасова змагаемся з будаўнікамі: то нас уключаць у план, то не.

База універсітэта — гэта не толькі вучэбныя карпусы і студэнцкія інтэрнаты. Гэта яшчэ і тэхнічнае аснашчэнне кафедраў і лабараторый сучасным абсталяваннем і тэхнічнымі сродкамі навучання, і эксперыментальная база для навукі, аб'екты сацыяльна-культурнага, аздараўленчага прызначэння, стварэнне ўмоў для ўсебаковага развіцця моладзі.

Калі я буду абраны рэктарам, то стварэнне базы універсітэта стане маім асноўным участкам работы.

— Але для паспяховай работы патрэбны аднадумцы...

— Сілы ва універсітэце ёсць. Вялікія. Іх патрэбна толькі прывесці ў рух. Гэта прарэктары, дэканы, загадчыкі кафедраў. Менавіта на іх вопыт, веды і майстэрства я разлічваю. Толькі ў цесным узаемадзеянні з імі можна дасягнуць поспехаў.

ПІНГ-ПОНГ

ПАДТАСОЎКА НЕМАГЧЫМА

«Вельмі прыемна было даведацца, што рэктар не прызначаецца вышэйстаячымі арганізацыямі, а выбіраецца. І ўсе ж, ці нельга больш падрабязна? Магчыма, гэта толькі слоўная падтасоўка, і «выбіраюць» «уверсе»?

Святлана ЗАХАРЭНКА, студэнтка».

Больш падрабязнага тлумачэння, чым у палажэнні «Аб парадку выбараў рэктараў вышэйшых навучальных устаноў», мы не знайшлі, а выпіска, якая прыводзіцца далей, здаецца, выключае ўсякую верагоднасць падтасоўкі:

Рэктары выбіраюцца на пашыраным пасяджэнні вучонага савета вышэйшай навучальнай установы тайным галасаваннем (студэнты павінны складаць да адной трэці састава пашыранага вучонага савета).

Вучоны савет ВНУ за два тыдні да правядзення выбараў паведамляе дату пашыранага пасяджэння вучонага савета, на гэтым пасяджэнні праводзіцца вылучэнне кандыдатур на пасаду рэктара. Рашэнне прымаецца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў і афармляецца пратаколам.

Спіс кандыдатур з указаннем займаемай пасады і месца работы, вучонай ступені і звання вывешваецца ў вышэйшай навучальнай установе за 10 дзён да выбараў.

На пасяджэнні пашыранага вучонага савета ВНУ па выбарах рэктара спачатку праводзіцца абмеркаванне кандыдатур, якія уносяцца ў адзін бюлетэнь для тайнага галасавання.

Згода ці нязгода з кандыдатурай выказваецца пакіданнем ці выкрэсліваннем у бюлетэні адпаведных прозвішчаў.

Для падліку галасоў пашыраны вучоны савет перад пачаткам тайнага галасавання выбірае адкрытым галасаваннем падліковую камісію з саставу тых, хто ўдзельнічае ў выбарах, колькасцю не менш чым 5 чалавек.

Падліковая камісія паведамляе вынікі галасавання па кожнай кандыдатуры. Пратакол падліковай камісіі зацвярджаецца пашыраным вучоным саветам адкрытым галасаваннем.

Рашэнне пашыранага вучонага савета з'яўляецца сапраўдным, калі ў галасаванні ўдзельнічала не менш 2/3 яго спісавага саставу. Выбраным лічыцца кандыдат, які атрымаў большасць, але не менш паловы галасоў тых, хто ўдзельнічаў у галасаванні. Калі ніводзін з кандыдатаў у першым туры не атрымаў дастатковай большасці галасоў, праводзіцца другі тур выбараў.

У бюлетэні другога тура ўносяцца кандыдатуры, якія атрымалі не менш 1/3 галасоў у першым туры. Выбраным лічыцца кандыдат, які атрымаў большасць, але не менш паловы галасоў прысутных членаў пашыранага вучонага савета. Пры раздзяленні галасоў пароўну правозіцца паўторнае галасаванне на тым жа пасяджэнні савета.

Калі ніводзін з кандыдатаў не атрымаў неабходнай колькасці галасоў або кандыдатура, выбраная пашыраным вучоным саветам ВНУ, не зацвярджаецца вышэйстаячым органам, праводзяцца новыя выбары.

НА ЎСЯЛЯКІ ВЫПАДАК

Экзамен для... вадзіцеляў

Вопытныя вадзіцелі ведаюць, з якой «залікоўкай» трэба з'яўляцца на тэхнічны агляд. На ўсялякі выпадак напамінаем ім і паведамляем навічкам, каб не забыліся яны пакласці ў кішэню: асабісты пашпарт грамадзяніна, тэхнічны пашпарт на аўтамабіль, матацыкл ці матаролер, талон тэхнічнага пашпарту (для прычэпаў), вадзіцельскае пасведчанне, даведку аб медыцынскім перааглядзе, квітанцыю аб выплаце падатку з уладальніка транспартнага сродку.

Калі ўладальнік індывідуальнага транспарту жадае правесці тэхагляд на станцыі тэхнічнага абслугоўвання, ён павінен, акрамя ўжо названых дакументаў, прадаставіць у ДАІ наступныя: даведку са станцыі тэхабслугоўвання, талон праверкі саставу адпрацаваных газаў і транспартны сродак.

У выпадку, калі ўладальнік індывідуальнага транспарту не мае магчымасці прадаставіць свой транспартны сродак на агляд у ДАІ, ён павінен у названы тэрмін (для раёна г. Мінска, дзе жыве) асабіста або праз давераную асобу перадаць у ДАІ тэхнічны пашпарт і квітанцыю аб выплаце падатку з уладальніка транспартнага сродку — для адпаведнай рэгістрацыі.

Прапануем расклад «іспытаў»:

Жыхары Фрунзенскага раёна, якія ездзяць на асабістых аўтамабілях, будуць трымаць свой экзамен-тэхагляд з 2 красавіка да 12 мая, Першамайскага — з 14 мая да 9 чэрвеня, Цэнтральнага — з 11 да 23 чэрвеня, Савецкага — з 25 чэрвеня да 31 ліпеня. Для ўладальнікаў матацыклаў і матаролераў — асобны графік.

Жыхары астатніх раёнаў могуць адкласці гэтую адказную падзею на 1991 год, але не павінны забываць, што ім таксама неабходна ўнесці падатак з уладальніка транспартнага сродку за бягучы год.

У. КРУМКАЧ,
старшы дзяржаўтаінспектар Маскоўскага РАУС г. Мінска.

ЯКІ РЭКТАР НАМ ПАТРЭБЕН?

Прыродазнаўца

Асабіста я лічу, што на пасаду рэктара неабходна выбраць прадстаўніка дакладных навук, прыродазнаўцу. Як правіла, такія людзі больш практычныя за навукоўцаў-гуманітарыяў. Магчыма, яны менш дасціпныя на словах, затое іх імкненні і задумкі рэальныя, іх справы канкрэтныя. Гэта людзі справы. Аднак, часта іх жаданне і намаганне дзейнічаць не зусім правільнае і патрэбнае. Быць на ўсе рукі майстрам, на жаль, нават рэктару не пад сілу, г. зн. пры шматпрофільных навуковых дысцыплінах, што выкладаюцца ва універсітэце, аднаму чалавеку немагчыма дасканала валодаць усімі. Таму новы рэктар павінен адразу ж наладзіць новую сістэму кіравання ва універсітэце і, безумоўна, стаўшы на чале гэтага механізму, не губляць над ім кантролю.

В. СВІРЫДАЎ,
дырэктар Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем, акадэмік АН БССР.

ПРАРАБ?

Калі глядзіш на пакуты студэнтаў і выкладчыкаў, навукоўцаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў універсітэта, якія туляцца зусім не ў прывабных пакоях і пакойчыках, узнікае толькі адно жаданне: каб рэктар быў добрым гаспадарнікам і меў пэўны вопыт «дыпламатычных» перагавораў з «неўтаймаванымі» будаўнікамі.

Хто ён?

Не адмаўляю, што адшукаць такога можна і ў нашым універсітэце.

Д. МАЛІНОЎСКІ,
студэнт, член вучонага савета.

«Рэктар, рэктар, дапамажы!»

Будучы рэктар, вядома, не залатая рыбка. Па першаму запатрабаванню студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта наўрад ці адразу зможа ўсіх ашчаслівіць. Аднак жа, на шчасце, нашаму будучаму кіраўніку пашанцавала. Сярод апытаных карэспандэнтамі «Беларускага універсітэта» кандыдатаў у «незадаволеныя бабулькі» не выявілася. Людскія попыты ў Белдзяржуніверсітэце ўмераныя, нават сціплыя. Але ўсе неадкладныя, надзённыя. Таму Яго Невядомасці Будучаму Рэктару прапануем прыняць да ведама сацыяльны заказ сваіх падначаленых. Некаторыя пытанні ананімныя, аднак іх наяўнасць і сапраўднасць «БУ» пацвярджае. Друкуем іх у парадку паступлення ў рэдакцыю.

— Кажуць, што зараз ВНУ атрымалі адносную самастойнасць і вырашэнне многіх універсітэцкіх праблем залежыць ад рэктара. Ці нельга скасаваць ва універсітэце «ваенку»?

— Беспрытульныя студэнты журфака спадзяюцца, што з прыходам новага рэктара скончыцца іх жыццё на «птушыных правах» у корпусе наргаса.

— Просім звярнуць увагу і на нас.

Сямейныя студэнты.

— Не паеду ў вёску да дзеда! Адмяніце добраахвотна-прымусовае размеркаванне.

Выпускнікі.

— Супрацоўнікі і выкладчыкі таксама людзі. Як хутка забяспечаць іх жыллём?

— Чытайце, пішыце, крытыкуйце, дапамагайце, але не прыціскайце.

Рэдакцыя «Беларускага універсітэта».

Шмат крытыкі гучыць сёння ў адрас партыі. Многія камуністы, страціўшы веру ў перамены да лепшага, пакідаюць яе рады. Іншыя, наадварот, аб'ядноўваюцца ў суполкі, каб абмяркоўваць надзённыя праблемы партыйнага жыцця і шукаць выйсце з крызіснага становішча. З такой мэтай прыйшлі камуністы універсітэта ў партклуб. Добраахвотна, без прымусу. Ужо адбыліся два пасяджэнні клуба: першае — арганізацыйнае, другое — па абмеркаванню механізму выбараў дэлегатаў на з'езды і канферэнцыі КПСС і КПБ.

Палітклуб запрашае ўсіх, у каго не згасла ў сэрцы іскрынка неабыякавасці, да размовы.

ПРАЕКТ

Палажэнне аб парадку выбараў дэлегатаў на партыйныя канферэнцыі і з'езды КПБ і КПСС

Грунтуючыся на рашэнні ЦК КПСС аб прадастаўленні партыйным арганізацыям права самастойна вызначаць парадак выбараў дэлегатаў на партыйныя канферэнцыі і з'езды і выконваючы даручэнне партклуба пры партыйным камітэце БДУ, ініцыятыўная група камуністаў універсітэта прапануе распрацаваны ёю праект «Палажэння аб парадку выбараў дэлегатаў на партыйныя канферэрцыі і з'езды КПБ і КПСС» для яго абмеркавання і дапрацоўкі. Мэта Палажэння — забяспечыць не на словах, а на справе дэмакратычныя выбары дэлегатаў, якім фактычна патрэбна будзе вырашаць лёсы як КПСС у цэлым, так і Кампартыі Беларусі ва ўмовах палітычнай сітуацыі, якая кардынальна і хутка мяняецца. Ад пазіцыі дэлегатаў будуць залежаць рашэнні з'ездаў і канферэнцый, выбары лідэраў,прадухіленне расколу партыі ці значнай страты ёю ўздзеяння на палітычныя, эканамічныя і духоўныя працэсы перабудовы, што адбываюцца ў краіне і рэспубліцы. Працэдура выбараў у партыі сёння — гэта пярэдні рубеж барацьбы за абнаўленне гуманнага і дэмакратычнага сацыялізму, за новае развіццё ідэй камунізму.

Дэмакратызацыя партыі немагчыма без забеспячэння рэальных умоў для свабоднага выказвання сваіх перакананняў кожным членам партыі і яго актыўнага ўздзеяння на вырашэнне любых пытанняў партыйнага жыцця.

Выказванне волі ўсіх камуністаў на з'ездах партыі магчыма толькі пры іх непасрэдным удзеле ў выбранні сваіх дэлегатаў шляхам усеагульных, прамых, альтэрнатыўных па аднамандатных акругах выбараў пры тайным галасаванні.

Сёння мы гаворым «не» многаступеньчатым выбарам — выбарам дэлегатаў на канферэнцыях і з'ездах, выбарам па шматмандатных акругах, любым іншым выбарам, якія захоўваюць нават самую малую магчымасць скажэння волі радавых членаў партыі.

Мы звяртаемся да ўсіх камуністаў з прапановай абмеркаваць і падтрымаць прапануемы парадак выбараў дэлегатаў на партыйныя форумы.

Мы звяртаемся да ЦК КПБ, абласных, гарадскіх і раённых камітэтаў з патрабаваннем правесці выбары дэлегатаў на партыйныя з'езды і канферэнцыі ў наступным парадку.

Прапануемы парадак выбараў рэгламентуе выбары дэлегатаў на раённыя, гарадскія, абласныя партыйныя канферэнцыі, канферэнцыі і з'езды КПБ і КПСС.

ПРЫНЦЫПЫ ВЫБАРАЎ ДЭЛЕГАТАЎ

Дэлегаты партыйных з'ездаў выбіраюцца з альтэрнатыўных кандыдатур па платформах на аснове ўсеагульных, роўных, прамых выбараў пры тайным галасаванні. Выбары праводзяцца па аднамандатных акругах з роўнавялікай колькасцю камуністаў.

Права выбіраць і быць выбраным маюць члены партыі незалежна ад іх партыйнага стажу, часу знаходжання ў партарганізацыі, займаемых пасад і любых іншых абставін. Кандыдаты ў члены КПСС не маюць права рашаючага голасу і не могуць быць выбраны дэлегатамі. Яны могуць удзельнічаць у перадвыбарнай кампаніі.

Вылучэнне кандыдатаў у дэлегаты і выбранне дэлегатаў ажыццяўляецца на сходах пярвічных партыйных арганізацый. Гэты парадак распаўсюджваецца і на членаў кіруючых выбарных органаў партыі, у тым ліку і на сакратароў партыйных органаў усіх узроўняў.

Грашовае і матэрыяльнае забеспячэнне правядзення выбараў ажыццяўляецца за кошт сродкаў партыйных арганізацый. Забараняецца выкарыстоўваць сродкі асобных камуністаў, дзяржаўных, грамадскіх і кааператыўных прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.

Кожны камуніст мае права прысутнічаць і са згоды камуністаў выступаць на іх сходах, удзельнічаць у якасці назіральніка пры галасаванні і падліку галасоў, знаёміцца з пратаколамі і любымі іншымі дакументамі і матэрыяламі падліковых і выбарчых камісій.

ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ У ДЭЛЕГАТЫ НА З'ЕЗДЫ КПБ І КПСС

Вылучэнне кандыдатаў у дэлегаты партыйных з'ездаў праводзіцца тайным галасаваннем на сходах пярвічных партыйных арганізацый. Права на вылучэнне аднаго кандыдата маюць пярвічныя партыйныя арганізацыі, якія налічваюць:

1 варыянт: не менш 150 членаў партыі;

2 варыянт: не менш адной дзесятай ад нормы прадстаўніцтва. Пярвічныя партыйныя арганізацыі меншай колькасці вылучаюць кандыдата на куставых сходах, якія збіраюцца саветам сакратароў гэтых арганізацый. Калі колькасць пярвічнай партыйнай арганізацыі ў некалькі разоў больш 150 ці нормы прадстаўніцтва, вылучэнне кандыдата адбываецца на сходах цэхавых партыйных арганізацый з правамі пярвічных колькасцю не менш за 150 чалавек (адной дзесятай ад нормы прадстаўніцтва) або на куставых сходах з той жа колькасцю членаў партыі. Сходы камуністаў правамоцны вылучаць кандыдатаў у дэлегаты з'езда, калі на іх прысутнічае не менш паловы агульнай колькасці іх камуністаў.

На партыйных сходах кожны камуніст мае права вылучаць кандыдатуру любога камуніста, які стаіць на ўліку ў рэспубліканскай партыйнай арганізацыі, у тым ліку і сваю кандыдатуру. Колькасць вылучаемых для абмеркавання на сходах кандыдатур не абмяжоўваецца. Сход можа вылучыць толькі аднаго кандыдата ў дэлегаты з'езда.

Вылучаным лічыцца кандыдат, за якога прагаласавала больш паловы прысутных на сходзе камуністаў.

Кандыдат у дэлегаты рэгіструецца выбарчай камісіяй пасля прадстаўлення выпіскі з пратакола сходу і пісьмовай згоды балатавацца па партыйнай акрузе. Кожны кандыдат у дэлегаты можа балатавацца толькі па адной выбарчай акрузе.

ПАРТЫЙНЫЯ ВЫБАРЧЫЯ АКРУГІ ПА ВЫБАРАХ НА З'ЕЗДЫ КПБ І КПСС

Для выбараў дэлегатаў на партыйныя з'езды адпаведныя партыйныя камітэты ўтвараюць партыйныя выбарчыя акругі, зыходзячы з нормы прадстаўніцтва. Партыйныя акругі фарміруюцца па тэрытарыяльнаму прынцыпу на аснове пярвічных партыйных арганізацый з улікам іх меркаванняў. У тым выпадку, калі колькасць пярвічнай партыйнай арганізацыі ў некалькі разоў перавышае норму прадстаўніцтва на з'езд, акругі ствараюцца на аснове цэхавых партыйных арганізацый з правамі пярвічных.

Стварэнне многамандатных партыйных акруг і вылучэнне кандыдатаў на канферэнцыях і з'ездах не дазваляецца.

ПАРТЫЙНЫЯ ВЫБАРЧЫЯ КАМІСІІ

Партыйныя выбарчыя камісіі ствараюцца з колькасці членаў КПСС, вылучаных на сходах пярвічных партыйных арганізацый (цэхавых з правамі пярвічных).

Кіраўніцтва дзейнасцю выбарчых камісій ажыццяўляюць арганізацыйныя камітэты па падрыхтоўцы з'ездаў, створаныя партыйнымі органамі.

Выбарчыя камісіі:

— ажыццяўляюць арганізацыйнае кіраўніцтва выбарамі і іх матэрыяльнае забеспячэнне;

— ажыццяўляюць кантроль за адпаведнасцю выбараў дадзенаму Палажэнню;

— праводзяць рэгістрацыю кандыдатаў у дэлегаты і забяспечваюць ім роўныя магчымасці для вядзення агітацыйнай работы сярод камуністаў акругі;

— на аснове пратаколаў падліковых камісій партыйных арганізацый праводзяць падлік галасоў і даводзяць да ведама камуністаў вынікі выбараў;

— абавязаны па патрабаванню камуністаў прадастаўляць ім неабходныя звесткі;

— аб'яўляюць выбары несапраўднымі, анулююць рэзультаты выбараў у пярвічных партыйных арганізацыях у выпадку парушэння парадку іх правядзення;

— назначаюць паўторыя выбары.

ВЫБАРЫ ДЭЛЕГАТАЎ НА КАНФЕРЭНЦЫІ І З'ЕЗДЫ КПБ І КПСС

Тайнае галасаванне па выбарах дэлегатаў з'ездаў праводзіцца ў пярвічных партыйных арганізацыях у дзень, прызначаны партыйным органам, які склікае з'езд.

Выбары дэлегатаў на абласныя, гарадскія і раённыя партыйныя канферэнцыі праводзіцца ў пярвічных партыйных арганізацыях і цэхавых партыйных арганізацыях з правамі пярвічных у адпаведнасці з нормай прадстаўніцтва ў тэрміны, вызначаныя адпаведным партыйным камітэтам. Толькі ў тых выпадках, калі колькасць нізавых структур партыйных арганізацый (партгруп, а пры іх адсутнасці — цэхавых з правамі пярвічнай або не маючых дзялення пярвічных арганізацый) у некалькі разоў перавышае норму прадстаўніцтва на канферэнцыю, галасаванне праводзіцца па спісах без абмежавання ў іх вылучаемых кандыдатур.

Да галасавання дапускаюцца камуністы, якія стаяць на ўліку ў данай партыйнай арганізацыі. Падліковыя камісіі выбіраюцца простай большасцю камуністаў, якія з'явіліся на галасаванне. Выбары праводзяцца незалежна ад наяўнасці кворума, неабходнага для правядзення партыйнага сходу.

Для галасавання камуністы атрымліваюць бюлетэнь устаноўленага ўзору, у які ўносяцца ўсе зарэгістраваныя кандыдаты. Бюлетэнь прызнаецца несапраўдным, калі ў ім пакінуты больш чым адзін кандыдат.

Выбары лічацца адбыўшымі незалежна ад таго, якая колькасць камуністаў выказала актыўнасць і прыняла ўдзел у галасаванні. Выбарчыя камісіі і партыйныя органы павінны ў абавязковым парадку папярэдне паведаміць усім камуністам месца і час правядзення выбараў.

Падвядзенне вынікаў выбараў дэлегатаў на з'езды ажыццяўляе акруговая выбарчая камісія на аснове пратаколаў падліковых камісій партыйных арганізацый. Выбарчыя камісіі складаюць зводную табліцу, у якой указваюцца партыйныя арганізацыі; колькасць тых, хто стаіць на ўліку ў кожнай арганізацыі камуністаў; колькасць камуністаў, што прынялі ўдзел у галасаванні; колькасць несапраўдных бюлетэняў; колькасць галасоў, пададзеных супраць усіх кандыдатаў; колькасць галасоў, пададзеных за кожнага кандыдата; абагульняючыя вынікі галасавання (Гл. прылажэнне 1). Табліца падпісваецца ўсімі членамі акруговай выбарчай камісіі і рассылаецца для азнаямлення ва ўсе партыйныя арганізацыі акругі.

Дэлегаты, выбраныя на абласныя, гарадскія, раённыя канферэнцыі, рэгіструюцца ў партыйных бюро або камітэтах на аснове пратаколаў падліковых камісій.

Выбраным лічыцца кандыдат у дэлегаты, за якога прагаласавала найбольшая колькасць камуністаў, што прынялі ўдзел у галасаванні.

Паўторныя выбары праводзяцца ў адпаведнасці з выкладзеным парадкам, калі папярэднія выбары прызнаны несапраўднымі ў сувязі з парушэннем парадку іх правядзення.

Прылажэнне 1.

ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ

дэлегатаў на..... з'езд КПСС (КПБ) па.....партыйнай выбарчай акрузе

№№ п/п	Назва партыйнай арганізацыі	Стаіць на ўліку членаў КПСС	Прынялі ўдзел у галасаванні	Несапраўдн. бюлет.	Галасавалі супраць	Іваноў	Пятроў
						за	за
Усяго:							

ЗАЎВАГА: запаўняецца акруговай партыйнай выбарчай камісіяй на аснове пратаколаў падліковых камісій. Падпісваецца ўсімі членамі выбарчай камісіі. Рассылаецца ў пярвічныя партыйныя арганізацыі.

АЎТАРЫ ПРАЕКТА члены КПСС: М. БАБІЙ, П. ЖУШМА, В. КІСЯЛЁЎ, А. КОСНІКАЎ, В. ПРОКАШАВА, В. ПУСТАВІТ.

«Мы — ліцэісты!»

У нерашучасці я спыніўся на парозе: маленькі пакойчык — на тры метры, пасярод — два ссунутыя адзін да аднаго сталы, вакол іх — ці не дзесяць чалавек. Няўжо гэта і ёсць кабінет дырэктара хвалёнай сярэдняй спецыялізаванай школы пры БДУ імя У. І. Леніна? І тым не менш я трапіў менавіта туды, куды і кіраваўся, да намесніка дырэктара па навуковай рабоце *Генадзя Уладзіміравіча ПАЛЬЧЫКА*. З ім, трошкі ачомаўшыся ад першапачатковай разгубленасці, я і пачаў сваю гаворку пра гэтую ўсё ж незвычайную і пакуль што адзіную ў сталіцы рэспублікі школу.

— Спецшкола пры універсітэце, або ліцэй, як пісалі газеты — што гэта такое? Покліч часу ці даніна модзе?

— Ідэя стварэння такой школы лунала ва універсітэце гадоў дзесяць, не менш,— пачаў свой аповед Генадзь Уладзіміравіч.— А вось магчымасцей ажыццявіць яе не было. Год-другі назад праблемы гэтыя — ну, скажам, праблема фінансавання — уяўляліся проста невырашальнымі. І толькі цяпер, з дапамогай новага міністра народнай адукацыі рэспублікі, спецыяльнай пастановай Савета Міністраў БССР школу, нарэшце, стварылі. Тады, гадоў дзесяць назад, гэта мо і было б данінай модзе, а сёння... Яна проста неабходна нам. Ліцэй (а менавіта так і павінна была называцца наша навучальная ўстанова, а не гэтай безаблічнай бюракратычнай назвай, якую яна атрымала пасля доўгага блукання папер па афіцыйных кабінетах) — гэта аптымальная форма падрыхтоўкі будучых студэнтаў.

— Чым адрозніваецца праграма ліцэя ад праграм агульнаадукацыйных школ?

— Прынцып навучання той жа, як і ў іншых спецыялізаваных школах: акрамя гадзін на вывучэнне агульнашкольных прадметаў, дадаткова адведзены гадзіны для прадметаў прафілюючых. У дадатак да гэтага пэўны час аддаецца спецкурсам і спецсемінарам па спецыяльнасцях на так званае працоўнае навучанне. Хоць наша школа і не мае статуса спецыялізаванай англійскай, аднак аб'ём ведаў па гэтай мове мы даём такі ж, як і ў спецыялізаванай. Заняткі фізічнай падрыхтоўкай — 4 гадзіны на тыдзень, з іх кожныя два тыдні адзін урок — урок танцаў.

Заняткі арганізаваны па сістэме ВНУ — парамі па 40 хвілін. Прафілюючыя прадметы чытаюць выкладчыкі універсітэта адпаведных факультэтаў і кафедраў. Ліцэй, па сутнасці,— падраздзяленне універсітэта. Адзін раз у тыдзень кожны клас праводзіць дзень у БДУ. Інфарматыку таксама вывучаем на базе вылічальнага цэнтра універсітэта.

М. ГІЛЕВІЧ.

Ліцэй — на пачатку шляху, яго навучэнцы і выкладчыкі робяць першыя крокі. Яны ўзялі на сябе адказны і складаны клопат. Не забіць неардынарнасць, падтрымаць, развіць талент.

«НАШЫ» ЗА МЯЖОЙ

Дортмунд сустракае вясну

Мы любім нашу старажытную Масленіцу. Для ўсіх, хто чакае цёплую лагодную Вясну, яна нібыта той парог, з-за якога Зіма ўжо не вернецца. Вясна прыходзіць на зямлю да ўсіх, на межы паміж краінамі не зважаючы. І заходнія немцы развітваюцца з зімой з не меншай радасцю, чым беларус ці украінец.

У горадзе пануе карнавал! Яшчэ з раніцы прыкмеціў на вакзале моладзь у касцюмах больш чым дзіўных, ды і ветлівыя прадаўшчыцы ў шматлікіх кафэ і кандытарскіх прыцягвалі ўвагу легкадумнасцю вопраткі — наведвальнікаў абслугоўвалі зайчыкі, Мальвіны, клоўны. Гэта быў наш другі дзень у Дортмундзе, гіды не пра ўсё яшчэ расказалі, таму мы чакалі развіцця падзей.

Гаманлівы, багаты на маскі і жарты натоўп уцягнуў нас у сябе пасля таго, як наша група выйшла з гарадской ратушы, дзе для савецкіх журналістаў быў наладжаны прыём.

Амаль кожны, хто прыйшоў сюды, лічыў сваім абавязкам неяк вызначыцца. Ці то неверагодным кацюмам, ці баявой індзейскай расфарбоўкай твару, ці ўдзелам ва ўсіх забавах, якімі вабіў карнавал. Рознакаляровыя панкі рассе́ліся побач з групай салдат бундэсвера, нейкі дзівак вітаў натоўп з ліхтаранага слупа, юная асоба дэманстравала міні-спадніцу, вельмі падобную на нешырокі рамень, добра вядомае на радзіме кола атракцыёна «Вертыкаль» скакала ўверх-уніз, то звальваючы ўдзельнікаў у кучу, то рассыпаючы па падлозе, рэплікі дзяўчыны-каментатара весялілі гледачоў не менш, чым само відовішча.

Было нязвыкла адчуваць аднолькавую зараджанасць усіх людзей весялосцю, імкненне радавацца самому і радаваць іншых. Успомнілася: наш родны чорна-шэры непаваротлівы натоўп паблажліва ўсміхаецца на рэпертуарныя жарты штатнага масавіка-зацейніка, на касцюмы, вядомыя з мінулагодняга гуляння...

С. ГРЫЦ.
Фота аўтара.

РЭПЛІКА

Айцец Надсан

Англійскі святар у Беларусі і на беларускай мове днямі заклапочана гаварыў аб адраджэнні беларускай нацыі. Айцец Надсан перажывае і за фізічнае выратаванне нашага народа. Прывёз тры тысячы аднаразовых шпрыцаў. І не было б у тым нічога дзіўнага, калі б мы не ведалі, што Надсан, перш чым разжыцца такім еўрапеізаваным прозвішчам, быў Алесем Бочкам, які нарадзіўся і вырас у пасёлку Гарадзея на Нясвіжчыне. У вайну, з маладых гадоў, разам з бацькам служыў фашысцкаму рэйху, таму самаму трэцяму рэйху, у планах якога не было месца ні духоўнаму жыццю, ні нават фізічнаму існаванню беларусаў. Уступіў у створаны гітлераўцамі «Саюз беларускай моладзі», скончыў кіруючыя курсы ў той арганізацыі. Пасля быў скіраваны да афіцэрскай школы так званай беларускай краёвай абароны, дзе яго бацька даслужыўся да капітана. З той школай уцёк у Германію. Павучыўся некаторы час у разведвальнай школе.

Цяпер службу сваю ў фашыстаў і ў іх арганізацыях трактуе выключна як службу дзеля будучыні беларускага народа, праўда, не ўдакладняе, якой будучыні. Лічыць, што менавіта яны далі штуршок абуджэнню яго беларускай свядомасці.

Пасля вайны, ужо стаўшы Надсанам, ён зноў заняўся «беларускімі справамі». Кім толькі ні быў цяперашні святар у эмігранцкіх арганізацыях, нават... афіцэрам бяспекі БНР (спатрэбілася такі разведшкола). Апошнія трыццаць гадоў — ксёндз, кіраўнік аб'яднання беларусаў у Вялікабрытаніі, нямала папрацаваў на ніве антысавецкай дзейнасці. З усіх пакаленняў беларускай эміграцыі прызнае перш за ўсё ваенную. Іншыя, сцвярджае, ехалі па кавалак хлеба, а ваенныя ўцекачы ў гітлераўскім абозе, на яго думку, гналіся за беларускай ідэяй... І цяпер ксёндз лічыць іх найбольш свядомымі беларусамі.

Зараз айцец Надсан зноў сабраўся дапамагаць у наладжванні беларускай будучыні...

(ШТОТЫДНЁВІК «7 ДНЕЙ», № 11 за 1990 год).

Страты ад хвалі цунамі

УРОК ВЯДЗЕ УЛАДЗІСЛАЎ ГЕРАСІМАЎ.

У канчатках ЕНИЕ, АНИЕ, НЕНИЕ, НАНИЕ хвалямі пераліваюцца галосныя. І стэнаграфічны знак, які абазначае гэтыя канчаткі, таксама падобны на хвалю:

ение (ание, нение, нание)

Знак СТ замяняў толькі дзве літары, але ўжо заўважна скарачаў напісанне слоў. Калі з'яўляюцца такія знакі, як ЕНИЕ, пісаць яшчэ весялей:

п ение пение сел еление деление веление

Хваля не павінна быць надта высокай:

Пры вельмі высокай хвалі слова таксама добра чытаецца, знакі не страчваюць свайго аблічча. І ўсё ж такі пры такім пісьме страты ёсць, толькі яны не ў знаках, а ў часе. Час напісання нізкай хвалі змяншаецца на 33 працэнты.

плетение мнение имение оскипание взведение лишение

Не падымацйе велізарныя хвалі-цунамі. Пяро павінна рабіць хістанні лёгкія, плаўныя. І ніякіх хваляванняў...

ПРАКТЫКВАННЕ:

Ведение подведение подселение подписание видение выделение испытание выселение.

Есть мнение. Плетение сети. В классе пение. Подписание писем. Видится селение. Мы идем в имение. Ведение дел. Выделение квартиры.

ВЕРТЫКАЛЬНАЯ ХВАЛЯ

св

Знак СВ — двумерная хвалістая лінія. Пяро хутка рухаецца ўніз, робячы пры гэтым лёгкае хістанне.

св свет светили свети светится свёл свели светлеть

ЗАВОЧНАЙ ШКОЛА СТЭНАГРАФІІ

свести сведи сведение свили подсветили подсвети свыше свист

У канцы слоў знакам СВ будзем абазначаць канчаткі СТВО, СТВИЕ. Словы з гэтымі канчаткамі даволі доўгія і таму перад апошнім знакам адну-дзве літары, як правіла, прапускаюць. У доўгіх словах пры чытанні яны лёгка аднаўляюцца.

де (й) ствие сле(д)ствие ве(ще)ство

Гэтыя словы крыху скарочаныя, таму на іх патрэбна звярнуць асаблівую ўвагу. Паставім іх у адзін рад з іншымі скарочанымі словамі.

действие следствие вещество свой свои своё своём своими

ПРАКТЫКАВАННЕ:

Мы все идем в свой класс. Вещество делится. Мы ведем следствие. Действие в школе. Мы мыли свой плед. Мы все едем в свое селение. Вещество светится. Мы свили плеть. Есть свой план. В классе свои планы. Ты слышишь свист. Свет в квартире. Следствие в школе. Действие силы.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВП імя Я. Коласа.

22 САКАВІКА
Зак. 2007.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.